# XIII сесія Генеральнай Асамблеі ААН

НЬЮ-ЙОРК, 24 верасня. (ТАСС). Учора на ранішнім пленарным пасяджэнні Генеральнай Асамблеі ААН працягвалася абмеркаванне пытання аб уключэнні ў парадак дня прапанаванага Індыяй пункта аб прадстаўніцтве Кітая ў ААН.

Міністр замежных спраў Непала Саха, які выступіў першым, заклікаў дэлегатаў Генеральнай Асамблеі не забываць аб адказнасці, якую яны возьмуць на сябе, адмовіўшыся разглядаць пытанне аб прадстаўніцтве Кітая. Гутарка, заявіў ён, ідзе не аб працэдурным пытанні, а аб пытанні надзвычайнай важнасці. Кітайская Народная Рэспубліка, падкрэсліў прадстаўнік Непала, не фікцыя, а аб'ектыўная рэальнасць, і таму вырашэнне пытання аб прадстаўніцтве Кітая ў ААН нельга больш адкладваць.

Прадстаўнік Цэйлона Карэа рашуча асудзіў амерыканскую рэзалюцыю, адобраную Генеральным камітэтам. Мы, заявіў ён, не можам згадзіцца з тым, каб ААН пазбаўлялася права ставіць на абмеркаванне Генеральнай Асамблеі жыццёва важныя міжнародныя пытанні.

Затым выступіў міністр замежных спраў Беларускай ССР К. В. Кісялёў.

## *Выступленне кіраўніка дэлегацыі Беларускай ССР К. В. Кісялёва*

Пан старшыня,
Панове дэлегаты,

Дэлегацыя Індыі і на гэтай сесіі прапанавала абмеркаваць і прыняць рашэнне па пытанню аб прадстаўніцтве Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Беларуская дэлегацыя горача падтрымлівае гэтую прапанову і лічыць неабходным выкласці свой пункт гледжання...

...дапусціць звароту да кашмарнага мінулага. Любыя спробы захаваць і вярнуць каланіяльнае панаванне, у якое б адзенне яно ні апраналася, асуджаны на правал. Кітайскі народ на працягу многіх дзесяцігоддзяў вёў цяжкую барацьбу супраць каланіялізма, мільёны кітайцаў аддалі свае жыццё ў гэтай барацьбе. Нарэшце ў 1949 годзе кітайскі народ атрымаў вялікую перамогу... ёсць подпіс і ЗША. Захапіўшы гэтыя астравы і перакінуўшы туды чанкайшысцкую зграю, звергнутую кітайскім народам, ЗША вось ужо 9 год выкарыстоўваюць іх для незлічоных ваенных правакацый і нападаў на Кітайскую Народную Рэспубліку, для падрыхтоўкі і развязвання ваенных канфліктаў у Азіі. Правячыя колы ЗША імкнуцца да таго, каб прымусіць кітайскі народ прымірыцца з акупацыяй Тайваня і іншых кітайскіх астравоў. Зразумела, што кітайскі народ не можа прымірыцца з гэтым і поўны рашучасці вызваліць свае спрадвечныя землі. Натуральна, ён жадаў бы мірнага вырашэння гэтага пытання.

Наша дэлегацыя лічыць неабходным звярнуць увагу Асамблеі на мемарандум Дзяржэпартамента ЗША пад загалоўкам «Палітыка адносна непрызнання кітайскага камуністычнага рэжыму». У гэтым мемарандуме ЗША спрабуюць апраўдаць сваю няправільную, архаічную палітыку ў адносінах да такога прадажнага і прагніўшага рэжыму, якім з'яўляецца чанкайшысцкі рэжым. Каб ашукаць сусветную грамадскасць, правячыя колы ЗША пускаюць у ход байкі аб тым, што нібыта ўрад КНР імкнецца «распаўсюдзіць камуністычнае

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы